**Бароўская І.А. (Гомель)**

**«Шануйце ж песні свае!»: алегарычная проза Максіма Багдановіча**

Высокая інтэлектуальнасць паэзіі М. Багдановіча прыцягвае ўвагу чытачоў, музычнасць яго паэтычных радкоў – кампазітараў. У лірыцы паэт найбольш дасканала спазнаў музыку прыроды праз музыку сэрца. Глыбокім псіхалагізмам, душэўнасцю лірычнага гучання, паўнатой светаадчування вылучаюцца песні і рамансы на яго словы («Астры», «Па-над белым пухам вішняў», «Блізка рэчкі-самацейкі» (музыка А. Туранкова), «Вечнасць», «Зімовы вечар», «Усё была ціха на зямлі» (музыка Л. Абеліевіча), «Скрылась кветамі», «Вакол мяне кветкі» (музыка А. Багатырова), «Ціха ўсё было на небе» (музыка І. Кузняцова), «Напілося сонца» (музыка Э. Тырманда), «Зімовая дарога» (музыка Р. Суруса) і інш.). М. Багдановіч ніколі не займаўся простай перапрацоўкай пэўных народных твораў, а імкнуўся развіць тэму верша, абыгрываючы яркія вобразы і матывы вуснай паэзіі. Гэта рабілася пры захаванні агульнага складу народнай вобразнасці і інтанацыі. Тым самым паэт адраджаў «забыты шлях» не толькі для літаратуры, але і для роднай песні, што найбольш яскрава праявілася ў творах «беларускага складу» («Як прыйшла я на ток малаціць» (музыка А. Аладава), «Ах, Лявоніха» (музыка А. Туранкова), «На Лявонавай кашулі» (музыка Л. Захлеўнага), «Не кувай ты, шэрая зязюля» (музыка Э. Наско).

Пра цікавасць М. Багдановіча да песні сведчыць цыкл у «Вянку», які мае назву «Згукі Бацькаўшчыны», а таксама некаторыя празаічныя творы. Думаецца, невыпадкова першым друкаваным творам пісьменніка стала празаічнае апавяданне алегарычнага характару «Музы́ка» (1907). У ім расказваецца пра Музыку і яго незвычайную скрыпку: калі плакала скрыпка ў руках Музыкі, то кожны «плакаў па сваёй долі», калі грозна гудзелі струны, «людзі падымалі апушчаныя галавы, і гневам вялікім блішчалі іх вочы» [2, с. 6].

У 1913 г. з’яўляецца «Апокрыф», прысвечаны тэме мастака і мастацтва. Твор цікавы як зместам, так і формай. Імітуючы біблейскі стыль, пісьменнік апавядае пра хаджэнне Хрыста з Апосталамі Пётрам і Юр’ем па Беларусі: ішлі «яны босымі нагамі, з непакрытымі галовамі, і былі адзеты ў белы кужаль ды суконныя світы» [2, с. 50]. Ніхто не звяртаў на іх увагі, толькі адзін Музыка пазнаў і падышоў да іх, з горыччу прызнаўся, што яму сорамна, бо народ працуе, а ён – не. У адказ пачуў словы Хрыста, што песня – душа народа, яна з чалавекам і ў радасці і ў горы, а калі «зварухнецца душа чалавека – толькі песня здолее спатоліць яе. Шануйце ж песні свае!» [2, с. 51]. Сапраўды, песня – выключная з’ява ў мастацкім бытаванні беларусаў, яна стала заканамерным вынікам працяглага, шматвяковага працэсу развіцця мастацкага слова і музыкі, якія ўвабралі ў сябе адметныя асаблівасці беларускага мыслення, светапогляду, маральна-этычнага ўспрыняцця рэчаіснасці. У ёй захаваны няўлоўны ход гісторыі і духу народа, уклад жыцця беларусаў.

У свой час Ф. Шылер уяўляў прыгажосць як аб’ект памкнення да эстэтычнай гульні і «бачнасць» жыцця, што нараджаецца гульнёй – адзіным шляхам пераадолення трагічнага разрыву чалавечай прыроды, яе незавершанасці. Блізкая да выказвання Хрыста ў М. Багдановіча («…Няма красы без спажытку, бо сама краса і ёсць той спажытак для душы» [2, с. 51])

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

думка Ф. Шылера: «Чалавек гуляе толькі тады, калі ён у поўным значэнні чалавек, і ён бывае ў поўнай меры чалавекам тады, калі ён гуляе» [3, с. 302]. Толькі эстэтычная гульня, сведчыць В.Ф. Асмус [1, с. 175], завяршае чалавечнасць у чалавеку, і толькі праз эстэтыку магчыма вярнуць адзінства, усебаковасць, гармонію фізічных і духоўных сіл.

У «Апокрыфе» з'яўляюцца вобразы коласа і васілька, дзе колас выступае сімвалам хлеба, працы надзённай, а васілёк – красы, прыгажосці. Расце васілёк паміж калосся. «Хлеб адбіраюць гэтыя сінія кветкі» [2, с. 51], бо на іх месцы выраслі б яшчэ каласкі, але не вырываюць іх, як зелле, а шануюць, прысвячаюць песні («няма лепш цвяточка над васілёчка»). Пытаннем Хрыста «нашто каласы, калі няма васількоў?» [2, с. 51] М. Багдановіч сцвярджае: не можа жыць чалавек як чалавек, калі не мае жадання імкнуцца да прыгожага, не мае мастацтва ў якасці сілы, субстанцыі, што яго ўзвышае.

Алегарычны па сваім змесце «Апокрыф» прымушае думаць, разважаць не толькі пра красу, але і пра сутнасць песні, пра яе месца ў жыцці народа.

**Літаратура**


1. Асмус, В.Ф. Историко-философские этюды / В.Ф. Асмус. – М., 1984.
2. Багдановіч, М. Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 2 : Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды. – 1993.
3. Шиллер, Ф. Собрание сочинений : в 7 т. / Ф. Шиллер. – М., 1957. – Т. 6.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ